■ Год малой радзімы

# АГРАСЯДЗІБА ДЛЯ БАЙКЕРАЎ. І НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ІХ

**Віцяблянін Алег УСЦІНОВІЧ на малой радзіме — у вёсцы Заазер'е Сенненскага раёна стварыў аграсядзібу Moto Rezervation. Ён арганізуе святы, на якія прыязджаюць госці з розных краін. Аднойчы да яго завіталі каля 2,5 тысячы чалавек. Напярэдадні пачатку чарговага байкерскага сезона карэспандэнт «Звязды» адправіўся ў Сенненскі раён, каб сустрэцца з актыўным і пазітыўным, неардынарным чалавекам.**



Алег усталяваў памятны знак, прысвечаны танкавай бітве пад Сянном, дапамог у здымках расійска-беларускага кінафільма, прысвечанага мясцінам, звязаным з вайной. Заўсёды з радасцю дапамагае дзецям-выхаванцам з інтэрнатаў.

А яшчэ ён загартоўваецца, стварае аўтарскія сувеніры, плануе вырабляць крафтавае піва.

Дарэчы, гаспадар не ўспрымае слова «байкер», бо нарадзіўся ў СССР, а тады такіх не было. Яго ведаюць многія матацыклісты. Для іх ён не Алег, а Лешы (у іх асяроддзі прынята звяртацца адзін да аднаго па мянушках). Нават мясцовыя дзеці з павагай клічуць яго так.

## Працягвае бацькаву справу

Алег нарадзіўся ў 1970-м у Сянне. Перыядычна жартуе з свайго ўзросту. Маўляў, стары ўжо. Пры гэтым ён у выдатнай спартыўнай форме, зімой любіць «купацца» ў снезе, абліваецца халоднай вадой, можа спаць нават на вуліцы. Сказаў, што з дзяцінства ў яго быў добры прыклад, як весці здаровы лад жыцця.

— Мой бацька Яўген Мікітавіч Усціновіч быў заслужаным трэнерам Беларусі па біятлоне. У Сенненскім раёне выхаваў знакамітых спартсменаў, у тым ліку і алімпійцаў. На жаль,








ён памёр ад цяжкай хваробы. Дарэчы, гэта ён прывіў мне любоў да Радзімы. Вельмі цікавіўся гісторыяй ваенных падзей. Перапісваўся з супрацоўнікамі архіваў, ваеннымі. Тата стаў ініцыятарам устанаўлення ў райцэнтры на п'едэстал танка, — расказвае суразмоўнік.

Калі мужчына дажываў апошнія дні, Алег паабяцаў яму, што працягне яго справу. І робіць гэта. Яму дапамагае яго старэйшы брат. Ёсць надзея, што і сын Ян, якому ўжо 22 гады, калі-небудзь таксама працягне тое, што распачалі бацька і дзед.

— Пастаўлю памятныя знакі, прысвечаныя памяці нашых воінаў, з усіх напрамкаў, што вядуць у райцэнтр. Першы ўжо ёсць, ён нагадвае пра падзеі танкавай бітвы, што адбыліся ў гэтых мясцінах. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што па маштабах яна была большай, чым вядомая ўсім Курская. Наверсе каменя частка гусеніцы чырвонаармейскага цяжкага танка. Тата мне расказваў, што яшчэ да канца 1950-х у палях было шмат пакінутай танкавай тэхнікі: нашай і нямецкай, — паказвае мне помнік.

## Неабходны... два слупы

Калі мы пад'ехалі да сядзібы MotoRezervation у вёсцы Заазер'е, сярод іншага кінулася ў вочы аб'ява на агароджы, што тут частуюць бясплатна кавай тых, хто прыехаў на двух колах. У незвычайнай сядзібе за «дзякуй» матацыклістам дапамагаюць, калі нешта здарылася ў дарозе.

— Гэта — закон для матацыклістаў — дапамагаць адзін аднаму. Так было, ёсць і будзе. Я, дарэчы, быў лідарам першага віцебскага матацыклетнага клуба «Жалезны крумкач». На сёння кірую філіялам аднаго з расійскіх, — працягвае суразмоўнік.

Паказаў пляцоўку, дзе праводзяцца розныя фэсты. А наконт меркавання, што арганізоўваць іх вельмі прыбытковая справа, адзначыў, — зусім наадварот.

Як растлумачыў суразмоўнік, каб запрасіць музыкантаў, рок-калектывы, майстроў вогненных шоу, трэба нядрэнна патраціцца. А хай і білеты за ўваход гледачы купляюць, але заробленыя грошы не пакрываюць выдаткі.

У MotoRezervation сярод іншага арганізуюць мотапікнік, прысвечаны Дню Перамогі. У праграме мотапрабег, палявая кухня, спаборніцтвы па стральбе сярод дзяцей і юнакоў ад 8 да 14 гадоў на прыз «Варашылаўскі стралок» ад Чашніцкай арганізацыі ДТСААФ, спаборніцтвы па рускім жыме і адцісканнях на «Кубак Перамогі». Вясковай дзятве вельмі падабаецца гуляць у лазертаг-гульні. І, каб убачыць цікавае, паўдзельнічаць у конкурсах, не трэба ехаць у Віцебск ці іншыя буйныя гарады.

— Арганізоўвалі і выставу міжнароднага фотапраекта «Вочы Перамогі». Ахвотныя павінны былі зрабіць фота ветэрана і напісаць трохі пра яго: дзе нарадзіўся, дзе прызваўся на фронт, сустрэў Перамогу, — тлумачыць арганізатар.

Падчас экскурсіі па сядзібе Алег паказаў будучую пастаянную сцэну для правядзення мерапрыемстваў. Тэлефанаваў знаёмым, каб падказалі, дзе знайсці жалезабетонныя слупы вышынёй па сем метраў, якія будуць неабходны для выступлення паветраных гімнастаў. Іх спецыяльна запросяць, каб выступілі на кульмінацыі, прасвечанай сенненскай танкавай бітве.

— Дзеля гэтых хвілін, каб убачыць усё на свае вочы, да нас прыязджаюць здалёк. У тым ліку і іншаземцы, — удакладняе суразмоўнік.

## Дапамагае дзецям

Матацыкліст часта бывае ў інтэрнатах, дзе выхоўваюцца дзеці. Ён стаў сябрам і для выхаванцаў Сенненскай школы-інтэрната, хлопчыкаў і дзяўчынак з няпростым лёсам ва ўстановах Віцебска, Гарадка, Мінска.

Дарэчы, наконт дзейнасці аграсядзібы: калі прыязджаюць з дзецьмі ва ўзросце да 14 гадоў, для апошніх усё бясплатна.

На тэрыторыі MotoRezervation можна палавіць рыбу, ёсць цудоўны пляж. А частка вадаёма спецыяльна ў купальны сезон агароджана сеткай, каб малыя дзеці далей не заплывалі.

У планах стварэнне штучнага басейна. Пашырэнне плошчаў для адпачынку.

На пытанне наконт умоў для вядзення сваёй справы Алег адказаў, што ў Беларусі ўсё створана для прадпрымальніцкай дзейнасці ў глыбінцы. Як гаспадар аграсядзібы плаціць адну базавую велічыню ў год.

У вёсцы, дзе ў асноўным дачнікі, збіраецца адкрыць краму. Ёсць ідэя варыць крафтавае піва...

У раёне яго вельмі паважаюць за тое, што ён робіць для землякоў. У Студзёнкаўскім сельсавеце вельмі хвалілі Алега. Дарэчы, тут усяго каля пяці аграсядзіб, а ў раёне пад дваццаць. Але, безумоўна, самая знакамітая MotoRezervation. І тыя, хто ўпершыню сюды трапілі, абавязкова хочуць зноў вярнуцца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара і з асабістага архіва Алега УСЦІНОВІЧА**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# 5 ПАМЫЛАК ПРЫ СЯЎБЕ ГАРОДНІНЫ



***1. Спяшаемся з пасевамі***

Па зямлі за зіму засумавалі, рукі да працы цягнуцца, ды і свежай гароднінай парадавацца хочацца як мага раней — вось і спяшаемся сеяць. Але нярэдка тым самым толькі дадаём сабе працы. І справа тут не толькі ў зваротных замаразках (хоць і яны могуць зрабіць сваю «чорную справу»). Асноўнае пытанне — гатоўнасць глебы. Калі, паспяшаўшыся, мы сеем у халодную, празмерна вільготную зямлю, насенне ў ёй «задыхаецца», гніе, але не прарастае. Яму не хапае цяпла, не хапае кіслароду — і ўсходаў мы можам не ўбачыць зусім.

Калі ўжо вельмі хочацца ранняй зеляніны, можна крыху раней накрыць выбраную градку плёнкай, прагрэць глебу і дачакацца, пакуль з яе сыдзе залішняя вільгаць, а потым ужо сеяць. Іншы варыянт — сяўба пад зіму. З восені можна пасеяць холадаўстойлівыя гародніну і зяленіва, а вясной радавацца іх усходам.

*Фізічная спеласць глебы, гэта значыць яе гатоўнасць да сяўбы, вызначаецца даволі проста. Бяром жменю зямлі, сціскаем у камяк і «кідаем» яго з вышыні каля 1 м. Саспелая глеба ўтварае камяк, які пры падзенні развальваецца. А калі глеба яшчэ не гатовая, мокры ліпкі камяк не рассыпаецца.*

***2. Пачынаем сяўбу занадта позна***

Бывае і так: часу не хапае, сяўбу адкладаем і прыступаем да яе, у выніку, з прыкметным спазненнем. Да чаго гэта прыводзіць? Увесну вільгаць з глебы сыходзіць вельмі хутка (выключэнне могуць складаць цяжкія глiністыя глебы), а для таго каб насенне прарасло, яна жыццёва неабходная. Калі з сяўбой мы запазніліся (глеба «пераспела» — камяк у руцэ не фармуецца, рассыпаецца адразу), насенне можа так і праляжаць у глебе, не даўшы парасткаў.

Вядома, выйсце ёсць: калі такое здарылася, давядзецца не ленавацца і рэгулярна паліваць градкі. Але начыстую — ці ва ўсіх ёсць такая магчымасць? Вядома, не. Калі мы прыязджаем на лецішча толькі па выхадных, хто ж будзе паліваць пасевы? Аднаразовага паліву, хутчэй за ўсё, не хопіць, і калі дажджоў не будзе, за тыдзень градкі высахнуць. Так што лепш не спазняцца.

***3. Забываем пра севазварот***

Напэўна, ні для кога не навіна, што чаргаванне культур (гэта значыць севазварот) — неабходны складнік добрага ўраджаю. Але, нават ведаючы аб гэтым правіле, выконваем мы яго не заўсёды — часам па легкадумнасці адмахваемся, часцей проста няма калі ў мітусні ўсё як след прадумаць і спланаваць. Што ў выніку?

Калі штогод сеяць на адным і тым жа месцы культуры з аднолькавымі патрабаваннямі да сілкавання, парушаецца баланс пажыўных рэчываў у глебе, адбываецца яе знясіленне. Мы ж не праводзім кожны сезон аналіз складу глебы і ўтрымання ў ёй розных элементаў — угнаенні ўносяцца, часцей за ўсё, зыходзячы з агульных рэкамендацый, па пэўных «усярэдненых» схемах, і можа ўзнікнуць дэфіцыт тых ці іншых важных элементаў.

Калі на адным і тым жа месцы вырошчваем культуры, схільныя да адных і тых жа хвароб, на якія нападаюць адны і тыя ж шкоднікі, мы тым самым уласнаручна ствараем крыніцы сур'ёзных праблем. Узбуджальнікі хвароб і лічынкі застаюцца ў глебе і паспяхова размнажаюцца — бо ўмовы мы ім забяспечылі.

Выйсце простае і складанае адначасова: абавязкова знаходзім час, каб спланаваць пасевы, размеркаваць па градках агародныя культуры з улікам іх правільнага чаргавання.

***4. Не ўлічваем патрабаванні культур***

Кожнаму віду гародніны — не толькі свой час, але і сваё месца. Аднаму вільгаць патрэбна, іншаму — інтэнсіўнае харчаванне і гэтак далей. Калі пасевы мы плануем загадзя, то, вядома ж, паклапоцімся аб тым, каб стварыць усім будучым «жыхарам» агарода камфортныя ўмовы. А вось калі часу зноў не хапае, калі сеем, «дзе месца ёсць», то можам і раслінам, і сабе цяжкасці арганізаваць.

Возьмем, для прыкладу, звыклую радыску. Без якіх-небудзь высілкаў з нашага боку яна дасць ураджай хіба што ранняй вясной, калі і вільгаці ў глебе ўдосталь, і спякоты няма, і дзень яшчэ досыць кароткі. А каб улетку караняплодам парадавацца, тут ужо падумаць трэба, улічыць яе патрабаванні і падабраць месца, дзе радыска ад засухі і спякоты пакутаваць не будзе. Ёсць, вядома, непатрабавальныя гародніна, якая расце, дзе ні пасадзі, але калі ўлічыць «пажаданні» кожнага, ураджай будзе большы, а клопатаў — менш.

***5. Грэбуем змешанымі пасадкамі***

Змешаныя і ўшчыльненыя пасадкі, якія сталі папулярнымі апошнім часам, — не даніна модзе, а вельмі рацыянальнае рашэнне многіх агародных праблем. Недахоп месца, пустазелле, шкоднікі і хваробы — разумнае камбінаванне культур на градцы дазваляе без дадатковых намаганняў справіцца з імі. Мы ж ведаем аб узаемным станоўчым уплыве тых ці іншых раслін, дык чаму ж гэтую ўласцівасць не выкарыстоўваць? І не будзем забываць, што карысць гэта можа быць яшчэ і прыгожая: тыя ж аксамiткі, напрыклад, і шкоднікаў адпудзяць, і градкі ўпрыгожаць.

Даты | Падзеі | Людзі

**11 КРАСАВІКА**

**У краіне**

**1128** год — узніклі першыя манументальныя помнікі эпіграфікі на тэрыторыі Беларусі, у раёне Заходняй Дзвіны. Вядома пра сем камянёў-валуноў з высечанымі на іх 6-канцовымі крыжамі і надпісамі ў выглядзе грэчаскай формулы «Господи помози рабу своему». Захаваліся тры камені: у музеі-запаведніку «Каломенскае» (Масква), каля Сафійскага сабора ў Полацку, у пасёлку Друя Браслаўскага раёна. Барысавы камяні да прыняцця хрысціянства з'яўляліся язычніцкімі фетышамі. Неўраджаі і голад на пачатку XII стагоддзя пацягнулі вяртанне насельніцтва да язычніцкіх вераванняў і шанавання камянёў, каля якіх раней маліліся пра ўраджай. Каб аб'яднаць паганскія і хрысціянскія культуры, узвысіць першых старажытнарускіх святых Барыса і Глеба і праславіць сваё імя, полацкі князь Рагвалод Усяславіч (пасля хрышчэння Барыс, правіў у 1127—1128 гадах) загадаў высякаць на валунах крыжы і хрысціянскія надпісы з імем Барыса (згадваецца на шасці камянях).



**1893** год — нарадзіўся Канстанцін Сямёнавіч Бакуновіч (в. Загор'е, цяпер у Навагрудскім раёне), удзельнік барацьбы за савецкую ўладу. З 1914 года быў у арміі, служыў у Кранштаце, з 1916 года — на крэйсеры «Аўрора». Прымаў удзел у ліквідацыі контррэвалюцыйнай стаўкі ў Магілёве, у атрадзе балтыйскіх маракоў змагаўся супраць войскаў Калчака, пад Царыцынам ваяваў супраць войск Дзянікіна. Памёр у 1974 годзе.

**1963** год — нарадзіўся (г. Гродна) Ігар Міхайлавіч Басінскі, беларускі спартсмен (стралковы спорт; стральба кулявая), заслужаны майстар спорту СССР і Беларусі, заслужаны трэнер Беларусі. Сярэбраны (1996, 2000 гады) і бронзавы (1988, 1996 гады) прызёр Алімпійскіх гульняў. Неаднаразовы чэмпіён і прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы, 10-разовы пераможца этапаў Кубка свету, 8-разовы чэмпіён СССР.

**У свеце**

*Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў. У 1945 годзе ва ўмовах разгрому нямецка-фашысцкіх войскаў у Другой сусветнай вайне вязні Бухенвальда на чале з інтэрнацыянальным палітычным цэнтрам паднялі ўзброенае паўстанне, у выніку якога захапілі лагер і ўтрымлівалі яго да прыходу саюзных войскаў.*

**1147** год — упершыню згадана слова «Масква». Князь Юрый Далгарукі запрасіў чарнігаўскага князя Святаслава Ольгавіча на сустрэчу, якая адбылася 11 красавіка 1147 года, фразай: «Приди ко мне, брате, у Московъ». Дзякуючы летапіснаму згадванню пра сустрэчу «ў Маскове» князь Юрый Далгарукі ўвайшоў у гісторыю як «заснавальнік Масквы».

**1836** год — выйшла ў свет першая кніжка літаратурна-крытычнага і гістарычнага часопіса «Современник», заснаванага А. С. Пушкіным. Выдаваўся да 1866 года.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.18 | 20.04 | 13.46 |
| Віцебск | 6.06 | 19.56 | 13.50 |
| Магілёў | 6.09 | 19.54 | 13.45 |
| Гомель | 6.08 | 19.48 | 13.40 |
| Гродна | 6.34 | 20.18 | 13.44 |
| Брэст | 6.38 | 20.16 | 13.38 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 8 красавіка. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Астапа, Івана, Кірылы, Марка.*
***К.*** *Ізольды, Лявона, Станіслава, Філіпа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Доктар, чаму ў мяне дрэнныя аналізы?

— А колькі вы заплацілі за іх?

— Пяцьдзясят рублёў.

— Добрыя аналізы каштуюць удвая даражэй.

**Мяняй нешта ў сваім жыцці! Сядзь на тэлевізар і глядзі ў канапу.**

У аднаго пастуха спыталі:

— Як вам удалося дажыць да 120 гадоў?

Ён адказаў:

— Па-першае, я на свежым паветры працую. А па-другое, ужо сто дзесяць гадоў я крычу на бараноў, а не наадварот.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1429.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 красавіка 2018 года.